ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
30
САКАВІКА
№ 11 (1604)

Пра універсітэт забыліся?

У спадчыну атрымалі мы памылковае ўяўленне аб нятленным багацці грамадства: толькі тое, што можна ўбачыць і памацаць рукамі — станкі, механізмы, камп'ютэры.

Дык вось, ствараючы планы эканамічнага і сацыяльнага развіцця на перспектыву, спачатку (асабліва ў Мінску, дзе размешчана большасць ВНУ рэспублікі) неабходна вызначыць расходы на адукацыю. Памятаеце, поспехі СССР у асваенні космасу амерыканцы назвалі вынікам аптымальнай сістэмы адукацыі. Тады мы выдаткоўвалі на адукацыю 10 працэнтаў нацыянальнага даходу. А цяпер? У ЗША паказчык вырас з 4 да 12 працэнтаў, а ў нас упаў да 7. Магчыма, і па колькасці студэнтаў на 10000 чалавек насельніцтва Штаты вельмі адчувальна абышлі нас амаль у паўтара раза таму, што мы эканомім на развіцці матэрыяльна-тэхнічнай базы вышэйшай школы. Няма нічога больш амаральнага, чым падлічванне расходаў на развіццё чалавека, якому давядзецца разгортваць свой патэнцыял у наступным стагоддзі. А ў «Тэзісах...» палажэння аб тым, каб усямерна дабівацца павышэння ўзроўню інтэлектуалізацыі моладзі, павышаць прэстыж звання «студэнт», я чамусьці не знайшоў. Ды й пра універсітэт, які, дарэчы, не мае права называецца флагманам вышэйшай школы, пакуль не будзе пабудаваны,— забыліся. Рашэнне ўрада аб нашым хуткім навасяленні ўжо прынята, а рэалізаваць яго без клопату гаркома і гарвыканкома і дапаўнення праграмы развіцця горада пунктам: «Забяспечыць выкананне пастановы ўрада рэспублікі», здаецца, не атрымаецца.

А. ЧАЛЕЙ,
дацэнт кафедры спектраскапіі і квантавай электронікі фізічнага факультэта.

УВАГА: КОНКУРС!

«ФІЛАСОФІЯ ПЕРАБУДОВЫ»

Камітэт камсамола, савет маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна і гаспадарча-разліковае падраздзяленне цэнтра НТТМ «Спектр» аб'явілі конкурс на лепшую работу па грамадскіх навуках» — «Філасофія перабудовы». Праводзіцца ён сярод маладых вучоных.

Да 1 чэрвеня саветам маладых вучоных універсітэта прымаюцца работы па наступных праблемах: заканамернасці і тэндэнцыі развіцця сучаснай навукі; эвалюцыя чалавека і чалавечых адносін у сучасных умовах: рэальнасць і ідэалы; чалавек, прырода і новыя тэхналогіі; светапогляд і творчасць; цэласнасць і супярэчнасці сучаснага свету; эканамічныя асновы сацыяльнай справядлівасці; творчы патэнцыял НЭПа і сучасная эканамічная палітыка партыі; дзейнасць КПСС па выпрацоўцы нацыянальнай палітыкі і ўдасканаленне нацыянальных адносін у сацыялістычным грамадстве; дэмакратызацыя кіравання і бюракратызм; моладзь і палітыка.

Для ўдзелу выкладчыкі, супрацоўнікі, аспіранты і студэнты БДУ ва ўзросце да 35 гадоў могуць падаваць работы (аднаго або некалькіх аўтараў), якія раней не прэміраваліся на дадзеным конкурсе, у выглядзе рукапісаў ці падборак лагічна звязаных артыкулаў — як надрукаваных, так і дасланых у друк.

Разам з работамі падаюцца: кароткая анатацыя, падпісаная ўсімі аўтарамі; выпіска-прадстаўленне навуковага семінара кафедры, савета маладых вучоных падраздзялення або камітэта камсамола універсітэта.

Для падвядзення вынікаў конкурсу ствараюцца конкурсныя камісіі па навуковых напрамках, якія адпавядаюць тэматыцы паступіўшых на конкурс навуковых работ. У іх састаў уваходзяць вядучыя спецыялісты, прадстаўнікі савета маладых вучоных і камітэта камсамола універсітэта. Работа конкурснай камісіі праводзіцца ў форме гутаркі (дыскусіі) на семінары пасля даклада аўтарам сутнасці зместу работы.

Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі пададзеных на конкурс работ з'яўляюцца: навуковая навізна; актуальнасць навуковых даследаванняў і атрыманых вынікаў; строгасць і абгрунтаванасць навуковых палажэнняў і вывадаў; практычная каштоўнасць работы; ступень асабістага ўдзелу ў правядзенні навуковых даследаванняў; арыгінальнасць пакладзенай у аснову работы ідэі.

Работа ацэньваецца тайным галасаваннем конкурснай камісіі.

Аўтары лепшых работ будуць узнагароджаны дыпломамі і грашовымі прэміямі. Устаноўлены чатыры грашовыя прэміі памерам 150 рублёў.

Усе прапановы аб вылучэнні работ на конкурс патрэбна накіроўваць на кафедру марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў універсітэта. Даведкі па тэлефоне 26-52-40 (Мішук Сяргей Сяргеевіч).

І. ПАРОМЧЫК.

ФОТА Ў НУМАР



Нечаканае знаёмства было прыемным. Хлопец усміхаўся адкрыта і шчыра, яго лёгка было фатаграфаваць.

Віктар Панцялееў — першакурснік факультэта радыёфізікі і электронікі. Нягледзячы на маладосць, ён абраны членам вучонага савета універсітэта, так што студэнты-навукоўцы маюць добрага абаронцу сваіх інтарэсаў. Ну, а вучоба — само сабой, без троек.

Фота С. ГРЫЦА.

АБ ВЫНІКАХ

фінансава-гаспадарчай дзейнасці універсітэта за мінулы год ішла размова на нядаўнім пасяджэнні рэктарата. Са справаздачай выступіла галоўны бухгалтар В. П. Саладуха.

24 красавіка 1988 года было прынята рашэнне савета універсітэта, накіраванае на далейшы пад'ём масавасці фізічнай культуры і спорту. Аб тым, як выконваецца гэта пастанова, інфармаваў членаў рэктарата загадчык кафедры фізвыхавання і спорту С. У. Макарэвіч.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

«КРУГЛЫ СТОЛ»

па праблемах аховы гістарычнай спадчыны праводзіць 5 красавіка а 14-й гадзіне (п. 605 галоўнага корпуса) універсітэцкая арганізацыя Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Прыняць актыўны ўдзел у яго рабоце запрашаюцца ўсе жадаючыя.

Т. ДОЎНАР.

НАЗЫВАЦЦА ПЕРАМОЖЦАЙ

— заўсёды ганарова. Вы таксама можаце заслужыць гэта званне, дастаткова прыняць актыўны ўдзел у аглядзе факультэтаў і кафедраў БДУ на лепшую пастаноўку інтэрнацыянальнай работы ў інтэрнатах. Мэта яго — удасканаленне ідэйна-выхаваўчай работы, пошук новых, найбольш эфектыўных форм і метадаў арганізацыі адпачынку студэнтаў, развіццё ініцыятывы органаў студэнцкага самакіравання.

Што для гэтага трэба? Не так ужо і многа праводзіць інтэрнацыянальныя мерапрыемствы ў адпаведнасці са сваімі планамі, праўда, узгадніўшы іх са студгарадком. У праграме мерапрыемстваў могуць быць: вечары дружбы, сустрэчы з цікавымі людзьмі, лекцыі, гутаркі, віктарыны, «круглыя сталы», пасяджэнні дыскусійных палітклубаў, канферэнцыі, дні кафедраў і г. д.

Нагадаем, што арганізоўваючы конкурснае мерапрыемства, факультэты і кафедры павінны падаць у журы (старшыня А. В. Шарапа — прарэктар па міжнародных сувязях) план яго правядзення. Пры ацэнцы мерапрыемства улічваецца яго інтэрнацыянальная накіраванасць, навізна формы арганізацыі адпачынку моладзі і г. д.

Пераможцаў агляду чакаюць узнагароды — Ганаровыя граматы, вымпелы, прызы і каштоўныя падарункі.

Р. ГАНЧАР,
загадчык кафедры рускай мовы як замежнай, намеснік старшыні журы.

ПРАШУ СЛОВА

Цяпер чарга за справамі

АДРАЗУ скажу: прачытаўшы праект «Тэзісаў праграмы па рэалізацыі важнейшых задач перабудовы» Мінскага гарадскога камітэта КПБ і Мінгарвыканкома ў «Вячэрнім Мінску» за 2 сакавіка гэтага года, усцешыўся. Пажадалася — каб чутае бачыць!

Мяркуйце самі: «Распрацаваць сістэму грамадскага кантролю за станам навакольнага асяроддзя, прадугледзеўшы ў ёй правядзенне незалежнай экалагічнай экспертызы праектаў новых вытворчасцей і тых, што рэканструююцца; арганізацыю кансультацый насельніцтва, а тткама грамадскага абмеркавання экалагічнай сітуацыі ў горадзе...» Альбо: «Вырашаць важнейшыя для жыцця горада пытанні толькі пасля ўсебаковага абмеркавання ў друку і ў працоўных калектывах, а ў выпадку адсутнасці адзінага меркавання — па выніках агульнагарадскога рэферэндума». Цяпер справа за тым, каб найхутчэй распрацаваць дакладны механізм гэтага грамадскага кантролю, рэферэндума, замацаваць яго юрыдычна рашэннямі Саветаў народных дэпутатаў, падтрымаць належным фінансаваннем. Тады і з'явіцца гарантыя, што ў горадзе знікнуць многія балючыя праблемы.

Прыемна бачыць, як у адказ на запатрабаванні грамадскасці ў праграме з'яўляюцца пункты, якія яшчэ ўчора не сустракалі разумення ў нашага кіраўніцтва. Так, у «Тэзісах...» прапануецца адкрыць у 1989 — 90 навучальным годзе ва ўсіх раенах горада школы з беларускай мовай навучання. А яшчэ ў мінулым годзе, калі моўная камісія Беларускага Фонду культуры прапаноўвала адкрываць не класы, а цэлыя беларускія школы, такія выказванні проста ігнараваліся.

Між іншым, мне самому даводзілася часта хадзіць па бацьках і агітаваць, каб тыя аддалі дзяцей у беларускія класы. І людзі часта пыталіся: «А чаму не ствараюць цэлыя школы з аднымі беларускімі першымі класамі? Чаму дзеці з маленькага класа павінны выглядаць «белымі варонамі» сярод агромністай школьнай грамады?» Сапраўды, а чаму? Чаму беларускае дзіця, калі яно жыве на сваёй Радзіме і гаворыць на сваёй роднай мове, павінна быць «белай вранай»? Я ўпэўнены: даўно ўжо патрэбна было смела арганізоўваць беларускія школы. Калі камусьці зусім не да спадобы — адвядзе сваіх дзяцей у суседнюю школу, дзе руская мова.

Многія пункты ў праграме патрабуюць дэталізацыі, канкрэтызацыі. Напрыклад: «Развіваць грамадскі рух «Родны горад». Якім ён будзе? Абмяжуецца толькі працайсуботнікамі ці стане сапраўдным грамадскім рухам за культурнае адраджэнне, за «беларусізацыю» нашай сталіцы?

Мне гэта бачыцца так. Да суботнікаў па рэстаўрацыі помнікаў, добраўпарадкаванню навакольнага прыроднага асяроддзя трэба заклікаць усіх жыхароў, у тым ліку і студэнцкія атрады, кааператывы, МЖК (яны маглі б аднаўляць і потым засяляцца ў старажытныя будынкі). Кожны суботнік павінен быць не толькі працай, але і сустрэчай з гісторыкамі, літаратарамі, музыкамі, каб грамадскае пачынанне было сапраўдным святам для людзей.

Варта адрадзіць краязнаўчы рух на ўзор 20-х гадоў, ствараць грамадскія музеі і выставачныя залы, наладзіць шырокую сетку народных універсітэтаў, курсаў беларускай мовы, гісторыі і культуры.

На грамадскае абмеркаванне патрэбна вынесці архітэктурны генплан Мінска, планы рэстаўрацыі помнікаў. У «Вячэрнім Мінску» добра было б узнавіць дыскусію па вяртанню старых назваў вуліц.

Шырока, як масавыя гулянні, адзначаць Міжнародны дзень аховы помнікаў (18 красавіка), Міжнародны дзень музеяў (18 мая), свята горада, свята мовы, традыцыйныя фальклорныя святы Купалле, Гуканне вясны, Каляды, дні памяці Радаўніца і Дзяды і інш.

Наогул жа, трэба сказаць, тэзіс «Падтрымліваць рост нацыянальнай свядомасці як важнага фактару перабудовы і дэмакратызацыі ўсіх бакоў нашага жыцця, забяспечыць вяртанне народу незаслужана забытых культурных каштоўнасцей і адраджэнне нацыянальных традыцый» не менш важны, чым тэзіс аб жыллёвай праграме, і яго патрэбна гэтак жа канкрэтызаваць і распісаць на вялікую перспектыву.

Трэба як мага хутчэй распачаць абмеркаванне і ўдасканаленне гэтай праграмы. Словы сказаны. Цяпер чарга будзе за справамі.

С. ВІТУШКА,
студэнт гістарычнага факультэта.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

Дзве рукі на семнаццаць найменняў

Скаргі і нараканні наведвальнікаў на небагаты асартымент нашага буфета, размешчанага ў корпусе бухгалтэрыі, мы выслухоўваем ледзь не штодзень. Каму, скажыце, да спадобы халодны шніцэль, кансерваваная салянка, чэрствыя булачкі і кава? Але ж разнастаіць ежу, павялічыць асартымент хоць бы да 17 найменняў, патрабуемых па мінімуму, фізічна немагчыма. Усе стравы дастаўляем са сталовай хімфака ўручную, а ў вёдрах, вядома, многа не прынясеш. Хадзіць туды-сюды некалькі разоў не хапае часу і сіл. Аўтамашыну для такіх рэйсаў таксама выдзяляць немэтазгодна. Зладзіілі неяк ва універсітэцкай майстэрні каляску, аднак яна справу не аблегчыла, хутчэй наадварот, бо важыла каля сарака кілаграмаў. Зноў вярнуліся да былой «механізацыі». Яна больш надзейная. Праўда, малаэфектыўная і зусім не аплачваецца, быццам буфетчыцы за 90 рублёў сам лёс наканаваў быць па сумяшчальніцтву яшчэ і грузчыкам. Але пакуль сумяшчальніцтва (і калі б толькі ў мяне адной!) не атрымліваецца, таму наведвальнікам не да раскошы — было б што-небудзь перакусіць, а нам не да плану. З такім нешматлікім асартыментам хіба нагандлюеш у месяц на 2800 рублёў? Тут не дзве, а два дзесяткі жаночых рук патрэбны, каб разнастайна запоўніць прылавак. Зрэшты, можна абысціся і адным грузчыкам.

Таццяна ЯФІМЕНКА,
буфетчыца.

Адкуль «усёведы»?

Я ніколі не чула, каб хтосьці з былых аднакурснікаў адмовіўся адказваць на пытанні выкладчыка. Быццам шчырае «не ведаю» абражае навуку больш, чым бязглуздзіца, якую ліхаманкава «ўспамінае» студэнт.

Мне здавалася: нават калі б выкладчыца рускай літаратуры прапанавала пісьмовую праверку ведаў па... сапрамату, напісалі б. Таму што большасць студэнтаў лічыць за лепшае накрэмзаць некалькі радкоў, няхай сабе і зусім не па тэме, чым распісвацца ў няведанні.

А цяпер мяне ніколькі не здзіўляюць лісты роспачы, якія атрымліваю з розных куткоў рэспублікі, куды сябры трапілі па размеркаванню. Мы ж падлічвалі па залікоўцы суму назапашаных ведаў замест таго, каб выпрацоўваць уласную пазіцыю. Толькі вялі гутаркі аб культуры мыслення, не ўмеючы сумленна вызначыць межы і мужна прызнаць уласную некампетэнтнасць перад чарговым этапам вучэбнай ці вынаходніцкай работы. Дзе там! Пры існуючай сістэме студэнта больш турбуе рэпутацыя ў вачах выкладчыка і адзнакі ў залікоўцы, чым трываласць ведаў. А прыехаўшы на месца работы, малады спецыяліст губляе самаўпэўненасць і наракае на страчаны час.

Вольга КАРАЛЕНКА,
выпускніца 1988 года.

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

Юнкоры вучацца пісаць



У іх яшчэ ружовыя мары, ім хочацца бескампрамісна ваяваць з бюракратамі і ездзіць у Нью-Йорк і Лондан. Але ў іх няма пакуль сапраўднага ўяўлення, што ж робяць журналісты. Тым не менш, яны маюць вялікае жаданне спасцігнуць таямніцы гэтай прафесіі. Я пішу гэта пра маіх выхаванцаў — слухачоў школы юнкораў факультэта журналістыкі.

У школе юнкораў, як, дарэчы, і ў астатніх універсітэцкіх школах юных — вучацца. Праўда, вучоба тут адрозніваецца ад той, што ў школе юных матэматыкаў ці фізікаў. У нас, акрамя азоў будучай прафесіі, хлопцы і дзяўчаты стараюцца выказваць асабістае меркаванне, вучацца слухаць субяседніка і весці спрэчкі. А падстава да размоў ці дыскусій у нас заўсёды ёсць. Мы шмат чытаем, назіраем за падзеямі ў краіне і за мяжой. Нам проста неабходна выказаць свае думкі.

Мы спецыяльна знайшлі для гэтага цікавую форму. У пачатку кожных заняткаў старшакласнікі пішуць невялічкія экспромты. Гэта ім дапамагае лагічна звязваць словы на паперы, карацей кажучы, яны вучацца пісаць. Пісаць па-журналісцку, а не ў стылі школьных сачыненняў.

А калі казаць пра поспехі, дык мне становіцца прыемна, што хлопцы і дзяўчаты могуць ужо адрозніваць рэпартаж ад артыкула і маюць публікацыі ў рэспубліканскіх газетах, як, напрыклад, Іна Качаткова і Наталля Іваненка.

Што будзе далей? Хочацца верыць — мае юнкораўцы паступяць на журфак.

Д. МАЛІНОЎСКІ.
кіраўнік школы.

НА ЗДЫМКАХ: у час заняткаў школы юнкораў.

Фота С. ГРЫЦА.

УНІВЕРСІТЭТ У ШЧАМЫСЛІЦЫ? А ЧАМУ Б НЕ?

«І мы «за» экалогію»

Я глядзела на гэты будынак, дакладней, на яго астаткі і прымала бок майго субяседніка. Будаваць універсітэт патрэбна. Не марудзячы, не адкладваючы на заўтра. Іншая справа: дзе і як? Аб гэтым сёння шмат спрачаюцца. У прэсе ўсё часцей і часцей чуюцца галасы супраць будаўніцтва. Гэтых людзей, напэўна, можна зразумець: ім не баліць, у іх няма праблемы, дзе вучыцца, дзе займацца навуковымі даследаваннямі. Але як чуць чарговае «нельга» ад тых, хто ведае стан матэрыяльнай базы універсітэта, асабліва катастрафічны недахоп плошчаў?

Уладзімір Рыгоравіч БАРЫШЭЎСКІ — прафесар, дырэктар Навукова-даследчага інстытута ядзерных праблем, вакол якога, дарэчы, больш за ўсё ідзе спрэчак, спрабуе ва ўсіх інстанцыях адстаяць свой пункт гледжання, пераканаць вучоных і грамадскасць у тым, што «яго» установа не будзе несці радыяцыйную пагрозу гораду, што яны таксама «за» экалогію.

—ПРАЕКТ новых вучэбных карпусоў і студэнцкага гарадка нашага універсітэта распрацаваў аўтарскі калектыў інстытута «Белдзяржпраект». Нельга сказаць, што варыянт ідэальны, але даволі прымальны. Ён адпавядае тым патрабаванням, якія былі прад'яўлены архітэктарам. Месца размяшчэння комплексу (ён будзе размежаваны на зоны — вучэбную, жылую, спартыўную, культурную) — раён пасёлка Шчамысліца. Улічылі і тое, што ў сувязі з будаўніцтвам павялічыцца паток пасажыраў на гарадскім транспарце па гэтаму маршруту. Праблему, спадзяваліся, дапаможа вырашыць метро, павялічаная колькасць скорасных і звычайных аўтобусаў. Карацей, засталося толькі ўзяцца і закласці першую цагліну ў фундамент. Ды, відаць, марная надзея на тое, што хутка будзем вучыцца ў новых аўдыторыях, жыць у добраўпарадкаваных інтэрнатах, весці навуковы пошук у сучасна абсталяваных лабараторыях...

Сыр-бор разгарэўся такі, што зараз і патушыць цяжка. Гучалі выказванні: «Хопіць Беларусі аднаго Чарнобыля!», «Ці патрэбны універсітэту інстытут ядзерных праблем?», «Хто выратуе помнік прыроды рэспубліканскага значэння — векавую дуброву?» Прама скажу: падагрэла грамадскую думку прэса. А павінны ж былі супрацоўнікі «Знамени юности», «Вячэрняга Мінска», рэспубліканскага радыё дэталёва ва ўсім разабрацца і толькі тады галасаваць «за» ці «супраць».

Ведаеце, часта ўся гэта валакіта здаецца мне дробязнай. Уявіце сабе такую сітуацыю. Вы стаіце на вакзале, сярод аўтобусаў і машын і не заўважаеце, чым дыхаеце. Але вось побач прайшоў чалавек з цыгарэтай, і вы адразу абураецеся: маўляў, што вы тут атручваеце людзей. Нешта накшталт гэтага атрымліваецца і з нашым інстытутам.

Калі пастаянна сачыць за матэрыяламі друку, заканамерна можна прыйсці да вываду, быццам наш інстытут наўмысна вядзе «аблаву» на рэліктавы дубовы гай: збіраецца атручваць яго дымам будучай кацельнай, знішчае дрэвы, расчышчаючы плошчу пад будаўніцтва аб'ектаў... Напэўна, кацельная сапраўды не лепшым чынам уздзейнічала б на дуброву, хоць працаваць яна павінна была на газе і прызначалася фактычна для абагрэву не інстытута, а універсітэта. Таму будаўніцтва яе спынілі. Гэта па-першае.

Па-другое, нашы заключэнні аб поўнай экалагічнай бяспецы работ, што праводзяцца ў інстытуце, пацвердзілі АН БССР, Інстытут біяфізікі Міністэрства аховы здароўя СССР і Гарадская санэпідэмстанцыя. Ні рэактараў, ні радыяцыйных адходаў у працэсе работы НДІ няма і быць не можа, таму што ў нас няма радыяцыйна небяспечных вытворчасцей. Мы ж займаемся не ядзернай энергетыкай, а фундаментальнай навукай. Па санітарных нормах тут могуць працаваць нават цяжарныя жанчыны.

Мне здаецца, што наадварот павінна быць зацікаўленасць у тым, каб наш інстытут як мага хутчэй змог працаваць нармальна, бо дзейнасць яго накіравана на ахову здароўя.

—ГЭТА даволі зразумела. Сёння мы шмат пішам аб выніках аварыі у Чэрнобылі. А яны, скажам прама, несуцяшальныя. Таму людзі і сталі баяцца ўсяго, што звязана са словам «ядзерны». Лічу, што асноўная прычыны страху — некампетэнтнасць і поўная неадукаванасць людзей у гэтых пытаннях.

Упэўнены, кожны будзе ў першую чаргу гаварыць аб радыяцыі, звязанай з будаўніцтвам АЭС. Многія нават выказваюць меркаванні, каб наогул абыходзіцца без атамных электрастанцый. Але гэта абсурд.

— **Напэўна, такія словы выклічуць у некага скептычную ўсмешку. Раскажыце, калі ласка, больш падрабязна аб гэтай дзейнасці.**

—ПАСЛЯ аварыі на Чарнобыльскай АЭС менавіта фізікі-ядзершчыкі далі сапраўдную ацэнку таму, што адбылося, і выказалі прагноз развіцця абстаноўкі на будучае. На кафедры ядзернай фізікі (інстытут як самастойная адзінка вылучыўся крыху пазней) быў створаны пункт пярвічнага абследавання радыяцыйнага паражэння людзей, вёўся кантроль за прадуктамі харчавання, глебай. Гэта ў нейкай ступені дапамагло зменшыць паніку сярод насельніцтва.

Зараз мы займаемся надзвычай важнай тэмай — распрацоўкай высокаадчувальнай апаратуры для кантролю за станам навакольнага асяроддзя. Справа ў тым, што апаратура такая выпускаецца і ў нас, і за мяжой, але дакладнасць яе ў вызначэнні ўзроўню радыяцыйнага выпраменьвання і радыёнуклідаў не задавальняе. Нам неабходна тэхніка з вялікай, якая дасягала б некалькіх квадратных метраў, адчувальнай паверхняй, прычым, зручная для транспарціроўкі. Устанавіўшы яе на аўтамашыне, самалёце ці верталёце, мы зможам кантраляваць усю тэрыторыю рэспублікі. Прататып такога комплексу (улічваючы вопыт нашых эксперыментатараў) быў створаны ў мінулым годзе і прайшоў паспяховае выпрабаванне ў палявых умовах.

— **Чаму, на Вашу думку, слова «ядзерны» выклікае сёння ў людзей панічны страх?**

Тым больш, што, як даказана навукай, такі тып радыяцыі амаль дробязь у параўнанні з той дозай, якую мы атрымліваем, грэючыся на паўднёвым сонцы, лётаючы на самалётах, праходзячы рэнтген. Акрамя гэтага, на нас уздзейнічаюць натуральныя крыніцы радыяцыі (касмічнае выпраменьванне і г. д.). Мы прывыклі да гэтага і не звяртаем увагі. Але вось тады, калі яе дзеянні пачынаюць прыводзіць да захворванняў больш частых, чым іншыя прычыны захворванняў і траўм, тады радыяцыя становіцца небяспечнай.

— **Уладзімір Рыгоравіч, Вы настойліва адстойваеце свой пункт гледжання. А ці лічыце Вы, што будаўніцтва універсітэта ў Шчамысліцы — аптымальны варыянт.**

—БЕЗУМОЎНА, не. Раней былі больш прымальныя прапановы. Толькі справа ад гэтага з месца не зрушылася. Якія ўмовы для студэнцкай навукі існавалі, такія і засталіся. І яшчэ невядома колькі гадоў будзем наракаць на недахоп плошчаў і сучаснага абсталявання. Сцвярджаю толькі адно: будаваць універсітэт патрэбна, і неадкладна. Наш інстытут таксама, які абавязкова павінен быць побач з універсітэтам, у прыватнасці, з фізічным факультэтам. Каб студэнты маглі па-сапраўднаму займацца навукай, а не саромецца, прыйшоўшы на вытворчасць, сваёй неадукаванасці і няўмення карыстацца навейшымі прыладамі, якіх, магчыма, у час вучобы і ў вочы не бачылі. А які ж сучасны універсітэт без навукі?

Інтэрв'ю правяла
З. АЛЯШКЕВІЧ.

А ШТО Ў ВАС?

Тут будзе МЖК

Доўгі і цярністы быў шлях спаборніцтва. Не так проста заваяваць права ўдзельнічаць у будаўніцтве МЖК, не так лёгка, нягледзячы на ўсе перашкоды і нягоды, пранесці веру ў ажыццяўленне гэтай ідэі. Пасля першых жа ўдараў лёсу амаль дзве трэці жадаючых — супрацоўнікаў універсітэта — адмовіліся ад задумкі будаваць самім сабе дом. Засталіся пяцьдзесят самых адданых, самых апантаных і верных прыхільнікаў руху. Яны паранейшаму працавалі на суботніках, нястомна адстойвалі сваю ідэю ў розных інстанцыях. І вось доўгачаканы вынік — у мікрараёне Уручча закладваецца першы падмурак жылога дома: першая радасць, першая перамога энтузіястаў. Ужо створаны і працуе цэнтр НТТМ, арганізаваны будаўнічы кааператыў. Нават швейнае абсталяванне закупілі. У перспектыве плануюць узяць у арэнду прадпрыемства па вытворчасці будматэрыялаў, тады можна будзе распачаць больш грандыёзную будоўлю. Фонды і грошы? Вядома, не з дзяржаўнай кішэні. У асноўным даводзіцца зарабляць на суботніках.

Здавалася б, так «набегам» не вельмі заробіш. Тым не менш ужо сёння МЖК заключыў дагаворы з рознымі арганізацыямі на выкананне работ на суму больш за 1 млн. рублёў. Атрымліваецца, быў бы стымул, знайшлася б ахвота, а грошы (прычым, немалыя) і на суботніках «грэбці» можна. Зрэшты, чаму толькі на суботніках? Вялікі даход прыносіць і выкарыстанне інтэлектуальнага патэнцыялу членаў МЖК. НДІ сродкаў аўтаматызацыі, напрыклад, пералічыла на рахунак МЖК 50 тысяч валюты сацыялістычных краін. Так што, ёсць магчымасць што-небудзь закупіць за мяжой. Гэта планы на будучае. Далёкае ці не, пакажа час. Напачатку ж патрэбна выканаць праграму мінімум, пабудаваць жылыя будынкі — сем стокватэрных дамоў. Сіламі непрафесіяналаў, безумоўна, ажыццявіць гэта нерэальна, таму звярнуліся на паслуг будтрэста № 1, які, апроч дапамогі спецыялістамі, згадзіўся навучыць членаў МЖК сакрэтам будаўнічага майстэрства. Праўда, за год часовай працы на будоўлі крыху паніжаецца прафесійны ўзровень супрацоўнікаў універсітэта, ды і грашовы бюджэт сям'і значна скуднее (заробак на будаўніцтве МЖК у сярэднім не перавышае 120 рублёў).

— Мэтазгодна было пакінуць членаў МЖК працаваць на палову стаўкі на асноўным месцы работы. Тады адначасова вырашаюцца абедзве праблемы: і ў прафесійным росце няма перарыву, і матэрыяльнае становішча неблагое. Спадзяёмся, што кіраўнікі падраздзяленняў пойдуць нам насустрач,— гаворыць член гарадскога штаба МЖК, выкладчык кафедры лічбавых метадаў і праграміравання механіка-матэматычнага факультэта Ю. В. Пазняк.— Калектыў МЖК, як кажуць, прайшоў агонь і воду, засталіся медныя трубы. Самае цяжкае — выпрабаванне на стойкасць, цярплівасць, гатоўнасць давесці пачатае да канца.

М. МАСТОЎСКІ.

ХУТЧЭЙ, ВЫШЭЙ, МАЦНЕЙ

Спорт для сапраўдных мужчын



ЦІ ЁСЦЬ у нас сапраўдныя мужчыны? Не можаце адказаць дакладна? Не сумнявайцеся — ёсць. А калі не верыце слову, схадзіце ў наступны раз на спаборніцтвы па гіравому спорту. На сёлетнім першынстве універсітэта па гэтаму віду выступалі мацнейшыя спартсмены, якія паказвалі раней выдатныя вынікі. Цяперашнія рэзультаты таксама задаволілі суддзю міжнароднай катэгорыі В. Д. Кавалёва.

Згадзіцеся, толькі сапраўдныя мужчыны могуць на працягу некалькіх гадзін ва ўпартай барацьбе дабівацца перамогі. Асабліва абвастрылася сітуацыя ў апошнія хвіліны, калі на адной прыступцы па колькасці балаў аказаліся У. Ціунчык (юрфак) і П. Дзяшкевіч (мехмат). Апошні падыход вырашыў усё: прызёрам першынства ў вазе да 80 кг стаў У. Ціунчык, набраўшы большую колькасць балаў. П. Дзяшкевіч заняў другое месца. І на трэцім — студэнт факультэта радыёфізікі і электронікі Д. Кажан.

Прызёрам у вазе да 70 кг стаў студэнт ФПМ В. Квочын.

А. ГУСАК,
студэнт гістарычнага факультэта.
Фота аўтара.



ЧУМА XX СТАГОДДЗЯ

Увага, СНІД!

Упершыню звесткі аб гэтым цяжкім інфекцыйным захворванні з'явіліся ў ЗША у 1981 годзе. Яно выклікана вірусам, якому падвергнуты як дарослыя, так і дзеці.

За перыяд з 1981 года па сённяшні дзень выпадкі захворвання СНІДам зарэгістраваны практычна ва ўсіх краінах свету, у тым ліку і ў СССР.

Вірус СНІДа разбурае ахоўныя функцыі арганізму, згубна ўздзейнічае на клетачны састаў крыві (лейкацыты). Вірус не ўстойлівы ў знешнім асяроддзі: ён гіне пад уздзеяннем сонечных промняў, а таксама пры тэмпературы 50°С. Перадаецца ў асноўным палавым шляхам, магчыма заражэнне і пры дрэннай апрацоўцы медыцынскага інструментарыя, пераліванні крыві. Часам можна пачуць сцвярджэнне, што СНІД перадаецца пры кашлі, поціску рук, чханні, карыстанні куханным і сталовым посудам. Але ўсе гэтыя довады беспадстаўныя. Захворванне часцей за ўсё сустракаецца ў гомасексуалістаў і тых, хто вядзе распутнае палавое жыццё, а таксама алкаголікаў, наркаманаў. Асноўныя прыкметы захворвання: павышэнне тэмпературы цела, павелічэнне лімфатычных вузлоў у падпахавых і пахавых абласцях і на шыі, «беспрычынная» хуткая страта вагі, паносы.

Апісаны выпадак СНІДа ў Маскве ў грамадзяніна СССР, які працаваў перакладчыкам у адной з развіваючыхся краін. За кароткі час ён уступаў у палавыя кантакты больш за 20 разоў з маладымі людзьмі абодвух полаў, якім і перадаў вірус СНІДа.

Усе выпадкі захворвання ў СССР, калі можна так сказаць, «імпартныя» — завезеныя замежнымі грамадзянамі, якія знаходзіліся ў Савецкім Саюзе ці савецкімі спецыялістамі, працаваўшымі за мяжой.

У 1987 годзе ў студэнцкай паліклініцы абследавана каля 4000 замежных навучэнцаў, што знаходзяцца на вучобе ў Мінску. Выяўлена 13 выпадкаў СНІДа. У 1988 годзе сярод замежных студэнтаў, што вучацца ў БДУ імя У. І. Леніна, таксама зарэгістравана хвароба. Усе хворыя адпраўлены на радзіму.

З мэтай ранняга выяўлення хваробы ўсе савецкія і замежныя грамадзяне, якія прыехалі з-за мяжы, лабараторна абследуюцца на наяўнасць віруса СНІДа. Абавязкова абследуюцца цяжарныя, а таксама прастытуткі, наркаманы, гомасексуалісты. Савецкім урадам прыняты закон аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці за распаўсюджанне захворвання, у якім прадугледжана пазбаўленне волі тэрмінам на 8 гадоў.

Хочацца спадзявацца, што гэты напамін аб страшным захворванні прымусіць кожнага з вас задумацца аб прафілактыцы. Пры з'яўленні вышэйназваных сімптомаў хваробы неабходна тэрмінова звярнуцца ў студэнцкую паліклініку на адрас: г. Мінск, вул. Сурганава, 45, кор. 4, або ў Рэспубліканскі скурна-венерычны дыспансер па вул. Прылуцкай, 47-а, п. 26.

В. ДАШКЕВІЧ,
Р. БАРАШ,
урачы службы ўрачэбнага кантролю студэнцкай паліклінікі.

Родная мова

Пачнём з сябе

У снежні мінулага года ва універсітэце была створана камісія рэктарата і парткома па развіццю беларуска-рускай двухмоўнасці. Узначаліў яе У. С. Багданаў, прарэктар па вучэбнай рабоце, прафесар. У студзені членамі камісіі былі распрацаваны «Прапановы па развіццю беларуска-рускай двухмоўнасці. Прадугледжана ў іх многае. Тут і сустрэчы студэнтаў і выкладчыкаў з дзеячамі беларускай культуры, гісторыкамі, і правядзенне ва ўсіх падраздзяленнях растлумачальнай работы, накіраванай на ўсведамленне неабходнасці і абавязковасці вывучэння беларускай мовы і заахвочванне выкладчыкаў, у першую чаргу гуманітарных факультэтаў і педагагічных аддзяленняў іншых факультэтаў чытаць лекцыі, весці семінарскія заняткі і практычныя, праводзіць экзамены і залікі, выдаваць свае навуковыя працы на беларускай мове, а студэнтаў — выконваць на ёй курсавыя і дыпломныя работы.

Былі і зусім канкрэтныя прапановы: стварыць камісію з прадстаўнікоў ВНУ і АН БССР для ўдасканалення дзеючых ці распрацоўкі новых праграм курсаў беларускай філалогіі і гісторыі БССР, увесці з наступнага навучальнага года ўступны экзамен па беларускай мове на педагагічныя аддзяленні, а таксама на выпускных курсах гэтых аддзяленняў — пісьмовы экзамен па беларускай і рускай мовах, арганізаваць агульнаўніверсітэцкую кафедру беларусістыкі (беларускай мовы і літаратуры, гісторыі і культуры Беларусі).

«Прапановы» былі апублікаваны ў газеце «Беларускі універсітэт» за 12 студзеня не толькі для таго, каб азнаёміць чытачоў з дакументам. Недэмакратычным і нават нерэальным у сённяшніх умовах палічыла камісія, не ўдакладніўшы, не выслухаўшы розныя меркаванні, навязваць факультэтам і кафедрам план мерапрыемстваў і тэрміны іх выканання і таму запрасіла ўсіх быць саўдзельнікамі: абмеркаваць прадстаўленыя «Прапановы» у кожным працоўным калектыве на працягу студзеня-лютага і перадаць водгукі і заўвагі старшыні камісіі.

Быццам бы ўсё добра прадумана. Камісіі засталося толькі гэтыя матэрыялы і ўласныя пажаданні студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў сістэматызаваць і прадставіць на абмеркаванне аб'яднанага пасяджэння вучонага савета і камітэтаў грамадскіх арганізацый універсітэта.

Часу было дастаткова. Ці выраслі мы за вызначаны тэрмін? Ці адчулі сябе, нарэшце, гаспадарамі ў справах роднага універсітэта? Лепшага паказчыка, чым колькасць прапаноў, якія паступілі да старшыні камісіі, шукаць — не знайсці. Да 27 сакавіка, калі адбылося пасяджэнне, як адзначыў дакладчык Л. М. Шакун, загадчык кафедры беларускай мовы, прафесар, яна заставалася мізэрнай. Ды й жадаючых выступіць на абмеркаванні не знайшлося.

А. І. НАРКЕВІЧ, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання, прафесар.

— Для журналістаў валоданне беларускай мовай — прафесійная неабходнасць. Але для паступлення на факультэт яе няведанне зусім не перашкода. Абітурыент мае права выбару. Знешне гэта выглядае даволі дэмакратычна. Толькі амаль усе выбіраюць рускую мову і літаратуру. Потым факультэт атрымлівае нараканні. Паспрабуйце ж навучыць чалавека пісаць на беларускай мове, калі ён да яе глухі.

Факультэт журналістыкі лічыць неабходным для сябе прадоўжыць паступовы пераход ўсіх журналісцкіх дысцыплін на беларускую мову, увесці з 1989 года абавязковы вусны або пісьмовы ўступны экзамен па беларускай мове і літаратуры, уключыць у вучэбны план завочнага факультэта курс «Практычная стылістыка беларускай мовы» і стацыянарны спецкурс «Культура вуснага маўлення», правесці навукова-практычную канферэнцыю па беларускай мове.

А. Я. СУПРУН, загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, прафесар:

— Лёс мовы вырашаецца не на пасяджэннях. І не вельмі проста. Многае залежыць ад таго, ці з'явяцца навукова-тэхнічныя (не літаратурныя) творы на беларускай мове. Такія, каб чалавеку перш чым прачытаць, давялося вывучыць мову. Хто, калі не універсітэт, зоймецца гэтай справай?

Я сам раней не валодаў беларускай мовай, толькі чытаў «ЛіМ». Ці варта кожнаму выкладчыку, незалежна ад таго, адкуль ён прыехаў, вывучаць мову? Я ўпэўнены — варта.

А. Г. СЛУКА, дэкан факультэта журналістыкі, прафесар:

— У нас не распрацавана канцэпцыя падрыхтоўкі нацыянальных кадраў. З першага верасня мы працуем па новых вучэбных планах, цяпер іх зноў трэба перагледжваць. Гадзін 400 у нас адводзіцца на замежную класіку (безумоўна, неабходны прадмет) і «карлікавы» курс (260, а можа і менш гадзін) па беларускай літаратуры. Яшчэ адно невыпадковае пытанне: «Ці будуць вылучаны сродкі на выкананне праграмы па беларуска-рускай двухмоўнасці?» Бо на энтузіязме і малым бюджэце цяпер беларускую культуру з месца не зрушыш.

С. С. ШУШКЕВІЧ, прарэктар па навуковай рабоце, прафесар:

— Я прадстаўнік дакладных навук. Многае цяпер трэба будаваць нанава. Мэтанакіравана беларуская мова была знішчана. Я памятаю гады сваёй вучобы. Тады ніводзін выкладчык не сказаў нам нават слова па-беларуску. І хоць мова наша такая ж старая, як і руская, мы згаджаемся з функцыянерамі ў галіне беларускай народнай адукацыі. Аспірант павінен здаваць залік па замежнай мове, а родную можа і не ведаць. Такім чынам мы лічым універсітэт беларускім толькі на шыльдзе.

Бяззубыя праграмы і прапановы нам не робяць гонару. Давайце пачнем з сябе — з заліка па беларускай мове для кожнага выкладчыка.

Магчыма, у выкананні прапановы — лічыць важнай асабістай справай гонару (і для студэнта, і для выкладчыка) веданне беларускай мовы і закладзены першы крок да рэальнай беларуска-рускай двухмоўнасці?

М. ПЯТРОВА.

ФОТА-КОНКУРС

ВЯСЕННІ ЭЦЮД

Фота В. ІВАНОВА.

ТАКІ дзіўны амерыканец

Уладкаваўшыся ў глыбокім мяккім крэсле, ён, здавалася, разам з усімі чакаў амерыканца, што вось-вось павінен прыйсці. Нічым асаблівым ад прысутных не адрозніваўся, толькі крыху раней вызваліўся ад пінжака. І сядзеў проста ў сініх джынсах і спартыўнага пакрою блакітнай рубашцы, падцягнуты і зграбны.

Потым усе, хто прыйшоў на гэту сустрэчу ў «Палітыкус» раптам зразумелі, што ён і ёсць той самы амерыканец, якога чакалі. Вельмі здзівіліся. Тут жа даведаліся, што перакладчыка на сустрэчу ніхто «не захапіў».

Я старанна вывуджвала з памяці англійскія граматычныя формы, каб задаваць пытанні. А ён раптам пачаў гаварыць на прыгожай беларускай мове. Здзівіліся яшчэ раз, і не апошні.

Перад намі сядзеў Юрый Аркадзьевіч Арэхва, грамадзянін ЗША. Менеджэр з Аргонскай Лабараторыі, што ў штаце Ілінойс. Спецыяліст у галіне рэактараў з ядзернай энергіяй. Яму 46 гадоў. Ужо другі месяц стажыруецца на фізічным факультэце БДУ. Жыве ў мікрараёне Паўднёвы Захад. Карыстаецца толькі грамадскім транспартам. Гутарка адбылася адкрытая, шчырая і добразычлівая.

— Першае пытанне, паважаны доктар, напрошваецца само сабой: чаму Беларусь?

— Ва ўзросце аднаго года разам з бацькамі я пакінуў СССР. Яны не толькі далі мне веданне роднай мовы ў вусным варыянце, але ў свой час зацікавілі і беларускай літаратурай.

У Вашынгтоне ёсць адна кнігарня. Штомесяц яна атрымлівае каля 700 новых выданняў савецкіх аўтараў. Трапляюць кнігі на беларускай мове.

Перад маім ад'ездам сюды старыя эмігранты з Беларусі гаварылі: «Ты едзеш на радзіму, дзе ніхто не размаўляе па-беларуску. Ты ж не ведаеш добра іх «інтэрнацыянальнай» рускай — што будзеш рабіць?» Дарэчы, яны заўсёды лічылі, што вывезлі з сабой і самую Беларусь. Але, як я бачу, гэта не што іншае, як самападман. Тут вакол мяне ўсе толькі і робяць, што спрабуюць вучыць мяне размаўляць па-беларуску. Нават фізікі...

— Але ж ад іх можна часта пачуць, што наша мова не здольна абслугоўваць фізіку, хімію. Маўляў, тут патрэбна англійская або японская...

— Некалі ў вашым універсітэце гэтыя навукі выкладалі толькі па-беларуску. Няма вялікай бяды, што ў фізіцы сапраўды шмат тэрмінаў з англійскай мовы. Важна, каб людзі паміж сабой гутарылі па-свойму.

— Што, на ваш погляд, можа прывабліваць у амерыканскай сістэме адукацыі.

— На першае месца я б паставіў узаемаадносіны паміж выкладчыкамі і студэнтамі. Яны не падобны на тыя, што я сустрэў у вас. У іх не толькі больш дэмакратычнасці, раўнапраўя, але і жарту, раскаванасці.

— Як студэнты могуць уплываць на лёс выкладчыка, які, па згадненню большай часткі курса, не адказвае пэўным прафесійным патрабаванням?

— Студэнты перыядычна выдаюць свой даведнік, дзе ёсць своеасаблівы хіт-парад выкладчыкаў. Гэта надрукаваная грамадская думка. Студэнт мае права замяніць прадметны курс аднаго выкладчыка на іншы. Але, паверце, сама адміністрацыя універсітэта не зацікаўлена даводзіць справу да эксцэсаў. Больш-менш паблажліва яна глядзіць на выкладчыкаў, у якіх з аратарскім майстэрствам не ўсё у парадку. Людзі ёсць людзі. Але гэта не датычыць прафесійнага ўзроўню. Перад тым, як зацвердзіць каго-небудзь выкладчыкам, яму прапануюць некалькі год працы ў якасці асістэнта. Ёсць час прыгледзецца, дапамагчы або сказаць «не».

— Ці зможа выпускнік БДУ працаваць у Злучаных Штатах без усялякіх экзаменаў, праверак?

— Медыцынскія пасады і шэраг іншых забаронены не толькі на савецкіх дыпломнікаў. Амерыканскія штаты адзін ад аднаго таксама адмежаваны ліцэнзіяй. Дарэчы, калі ў цябе дыплом аб атрыманні журналісцкай адукацыі, смела прыязджай у ЗША. Для журналістаў ліцэнзій няма. Каб набыць гэту прафесію ў ЗША, маладыя людзі прыходзяць на гістарычны і іншыя факультэты.

— Наколькі значныя сярод амерыканцаў спрэчкі аб спосабе атрымання энергіі з ядзерных рэактараў?

— Апошні ядзерны рэактар у ЗША заказвалі ў... 1974 годзе. Некаторыя з тых рэактараў толькі цяпер пачынаюць працаваць. Іншыя заказы далей дакументацыі не пайшлі. А па некалькіх — ад гатовых рэактараў адмовіліся.

Часам нейкая кампанія вырашае здабываць энергію з дапамогай рэактара, бярэ ў банку крэдыт 10 мільёнаў долараў. Будуе рэактар, да ўводу яго ў дзеянне застаецца выканаць невялікую «дробязь» — атрымаць ліцэнзію. Тут і прыходзіць час заўважыць, якую значную моц набыў у ЗША рух «зялёных», не лічыцца з ім — сабе даражэй. «Дробязь» вырастае ў сапраўдную Гадзіну грамадскасці! Бо яна судзіць-радзіць гэты рэактар, як ёй захочацца, карыстаючыся свабодай слова. Устаўляе ўсё новыя палкі ў колы, і не тыдні гэта цягнецца, бывае, гадамі. З фінансавага боку для кампаніі складваецца жудаснае становішча, працэнты на тыя мільёны растуць, але ад рэактара ні электрычнасці, ні грошай...

Зараз у свеце ў гэтым напрамку змянілася многае. Да 2000 года спыніць свой апошні рэактар Швецыя. Наша Лабараторыя, напрыклад, правярае цяпер кардынальна новую мадэль рэактара, што ў экстраннай сітуацыі сам сябе адключае.

З другога боку, куды дзецца ад парніковага эфекту? Французскія вучоныя канчаткова высветлілі, што ніякай дзіркі над Антарктыдай пакуль што няма. Але відавочна, што ў выніку чалавечай дзейнасці азон знішчаецца. Выкарыстанне ж ядзерных рэактараў у гэтым плане абсалютна бясшкоднае.

— Дазвольце несур'ёзнае пытанне. Якімі вы знаходзіце жанчын у Мінску?

— Калі ласка. У амерыканак больш забяспечаны выбар сродкаў, каб выглядаць на ўзроўні. А савецкія жанчыны больш забяспечаны цяжкімі сумкамі і доўгімі чэргамі. Асобна трэба гаварыць аб тых жанчынах, якія і сёння сваёй працай падтрымліваюць вядомы ў ЗША стэрэатып: жанчына з рыдлёўкай ў руках, разгортвае снег, жанчына з мокрай анучай і вядром. Мне балюча за іх. Сёння ў развітых краінах прыбіральшчыцы нават і не дакранаюцца да вады, і ўборка снегу механізавана паўсюдна.

Але ж жанчыны Мінска валодаюць вялікай каштоўнасцю. Мужчыны ва ўсім свеце скажуць, што сапраўдная жанчына — гэта натуральнасць, стрыманасць, добры густ. І тут мінчанкі даюць амерыканкам фору. Апошнія больш любяць эксцэнтрычнасць і ў макіяжы, і ў адзенні...

...Позным вечарам ён вяртаўся дадому па ціхаму, цёпламу Мінску. Вакол гучала руская мова. Дзіўны амерыканец... Вывучыў беларускую мову. Хоць не карыстаецца ёй у сваёй Амерыцы ні ў лабараторыі, ні ў супермаркеце...

А. ТАЧЫЦКАЯ,
студэнтка факультэта журналістыкі.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа
30 сакавіка
Зак. 1617.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.